# РОЛЯ БАЦЬКОЎ
# У САЦЫЯЛІЗАЦЫІ ДАШКОЛЬНІКАЎ

*ГРЫМАЦЬ А.А., ПАЗДЗЕЕВА Т.В.*
*/Рэспубліка Беларусь/*

Выхаванне дзяцей у сям'і з'яўляецца не толькі асабістай справай бацькоў, але і іх абавязкам, паколькі цэльнасць асобы заўседы вызначаецца яе значнасцю для грамадства і залежыць менавіта ад выхавання.

У выхаванні дзяцей уплыў бацькоў намнога больш за іншыя педагагічныя ўздзеянні. Там удумлівыя, уважлівыя адносіны да дзяцей, да іх выхавання ў значнай ступені вызначаюць поспех працэсу фарміравання асобы, духоўнага развіцця дзяцей, станаўлення маральных каштоўнасных арыентацый.

Асноўным фактарам сямейнага выхавання з'яўляецца яго глыбока эмацыянальны, інтымны характар. Сямейнае выхаванне грунтуецца на бацькоўскіх пачуццях, выражаецца ў любові і клопату бацькоў аб дзецях і такіх жа самых пачуццях дзяцей да бацькоў.

Сіла і эфектыўнасць сямейнага выхавання заключаецца ў тым, што выхаваўчае ўздзянне сям'і пастаяннае і доўгатэрміновае ў самых разнастайных сітуацыях. Яно здзяйсняецца штодня.

Сям'я мае безліч магчымасцей для ўключэння дзяцей у гаспадарчую, выхаваўчую, працоўную дзейнасць, клопат аб доме і блізкіх, самаабслугоўванне.

Мы выдзелілі наступныя прынцыпы, якімі неабходна кіравацца выхавацелю пры арганізацыі ўзаемасувязі ў выхаваўчай дзейнасці дашкольнай установы і сям'і ў фарміраванні маральных каштоўнасных арыентацый, сацыялізацыі дашкольнікаў:

- адзінства ў разуменні мэт і задач, сродкаў, метадаў і форм выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту;

- рэалізацыя ў сумеснай дзейнасці комплекснага падыходу да выхавання;

- адносіны да дзіцяці, члены сямейнага і дзіцячага калектыву, як да асобы, што фарміруецца і развіваецца, глыбокая павага да яго;

- узаемная павага і ўзаемны давер у адносінах паміж педагогамі і бацькамі;

- узаемная дзелавая крытыка і самакрытыка.

Садружнасць, узаемаразуменне, узаемадапамога сям'і і дзіцячага сада - вось без чаго нельга сення ўявіць правільнае і паспяховае развіцце асобы дзіцяці, яго сацыялізацыю.

Характар і выніковасць узаемадзеяння педагогаў і бацькоў залежыць ад узаемных установак: жадання і ўмення ўзаемадзейнічаць і паважаць ~дзін аднаго. Калі кожны з бакоў лічыць, што можа з поспехам выконваць свае выхаваўчыя функцыі самастойна, тады сапраўднага ўзаемадзеяння не атрымаецца, бо ўзаемаразуменне паміж бацькамі і выхавацелем не нараджаецца само па сябе.

Можна выдзеліць дзве групы задач, якія ставяць перад педагогам у сацыялізацыі дашкольнікаў:

- псіхолага-педагагічная асвета бацькоў з мэтай павышэння ўзроўню педагагічнай адукацыі;

- вывучэнне абставін жыццядзейнасці канкрэтнай сям'і і ўстанаўленне кантактаў з яе членамі.

Першая група ўключае задачы інфарматыўнага плану /азнаеміць з узроставымі асаблівасцямі дзяцей/, ахарактарызаваць разумовыя і фізічныя магчымасці дзіцяці, эстэтычныя і маральныя ўяўленні дашкольніка, раскрыць патэнцыял выхаваўчага ўздзеяння бацькоў, уменне развіць навык маўлення, арганізаваць гульню, працу па самаабслугоўванню, выхоўваць пазітыўныя адносіны да блізкіх, прыроды, Радзімы і г.д. Пры арганізацыі педагагічнай асветы вырашальным з'яуляецца індывідуальны падыход, а гэта патрабуе дэтальнага і рацыянальнага планавання кожнай сустрэчы з бацькамі, вызначана яна перспектыўным планам ці адбылася выпадкова.

Трэба памятаць, што ў зносінах з бацькамі бацькі, перш за

ўсе, хочуць пераканацца ў добрым стаўленні выхаваццеля да дзіцяці. Без уліку гэтага фактару супрацоўніцтва немагчыма. Вось чаму выхавацель павінен добра падумаць, як заслужыць давер бацькоў, іх павагу, абудзіць веру ў сваю зацікаўленнасць да лесу дзіцяці, добрыя адносіны да яго. Дасягнуць гэтай мэты можна, праявіўшы свой прафесіяналізм, веды, уменні і навыкі працаваць з дзецьмі, педагагічную тактоўнасць.

Задачы вывучэння кожнай канкрэтнай сям'і яшчэ больш складаныя. Увайсці ў кожны дом, пазнаць радасці і клопаты сям'і, яе надзеі і мары можа толькі шчыры, добры, прафесійна падрыхтаваны педагог, які добра ведае заканамернасці зносін з бацькамі.

Поспех педагагічнай асветы бацькоў, вынікі вывучэння абставін сямейнага выхавання вызначаюцца:

- дакладным адборам зместу, форм і метадаў такой дзейнасці;
- псіхалагічным настроем як выхавацеля, так і бацькоў.

Гэтым абумоўлена неабходнасць:

- дыферэнцыяцыі работы з бацькамі, гэта значыць з паасобнымі групамі, якія выдзяляюцца з усей сукупнасці ў залежнасці ад узроўню педагагічных ведаў, уменняў і навыкаў; ад асаблівасцей дзяцей, узроўню развіцця іх схільнасцей і здольнасцей;
- індывідуалізацыя ўзаемадзеяння з бацькамі ў залежнасці ад культурнага і адукацыйнага ўзроўню, адносін да працэсу выхавання, сямейных абставін.

Работа з бацькамі будзе насіць канкрэтны, дзейсны характар, будзе спрыяць узаемаразуменню і ўзаемнаму супрацоўніцтву бацькоў і выхавацеляў, калі будуць вырашаны наступныя задачы;

- азнаямленне з матэрыяльнымі ўмовамі жыццядзейнасці сям'і, яе псіхалагічным мікракліматам, асаблівасцямі паводзін дзяцей у сям'і;
- вызначэнне ўзроўню педагагічнай культуры бацькоў;
- выяўленне цяжкасцей, з якімі сутыкаюцца бацькі ў працэсе выхавання;

- вывучэнне станоўчага воныту сямейнага выхавання з мэтай яго распаўсюджвання;

- здзяйсненне групавога, дыферэнцыраванага і індывідуальнага педагагічнага ўздзеяння на бацькоў з улікам деталевага аналізу звестак, якія мае выхавацель аб кожнай сям'і.

# ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ЯК ПРАЦЭС САЦЫЯЛІЗАЦЫІ

*АДАМОВІЧ С.А.*
*/Рэспубліка Беларусь/*

У сучасных умовах нацыянальныя праблемы сталі ў ліку важнейшых. Іх тэарэтычная распрацоўка і практычнае рашэнне набываюць асаблівую важнасць і актуальнасць. Абвостраная ўвага да іх абумоўлена не толькі эвалюцыяй грамадства ў цэлым, але і эвалюцыяй саміх нацый, народнасцей, бурным развіццем іх самасвядомасці. Такім чынам, каб выявіць прычыны ўзнікшай нацыянальнай напружаннасці, растлумачыць усплеск нацыянальных пачуццяў, інтарэсаў неабходна глыбока прааналізаваць не толькі эканамічныя, прававыя, культурныя, моўныя, маральныя аспекты сучасных нацыянальных адносін, але таксама і праблемы нацыянальнай псіхалогіі, вызначыць яе ролю ў міжнацыянальных зносінах.

Праблема нацыянальнай самасвядомасці з'яўляецца адной з найбольш мала вывучаных тэарэтычных праблем. Да 60-х гадоў аб нацыянальнай самасвядомасці як характарыстыцы, прыкмеце нацыі практычна не гаварылася. Аднак у апошні час яна прыцягвае асаблівую ўвагу. Сумесныя даследванні філосафаў, псіхолагаў і педагогаў дазволілі распрацаваць канцэпцыю нацыянальнай самасвядомасці, выявіць яе структуру, шляхі яе станаўлення і развіцця.

Самасвядомасць - уласцівасць, характэрная для грамадства,